*Энгельс Дарашэвіч*

## ДУХОЎНАСЦЬ НЕ МАЕ КОШТУ

Ёсць успаміны, якія цягам часу становяцца ўсё больш яскравымі і значнымі. У мяне так з фестывалем «Берагіня», на які я быў запрошаны ў чэрвені 2012 года ў Рудабелку, зараз вядомую як Акцябрскі. Навакольныя мясціны – так званая «Рудабельская Рэспубліка» – шырока вядомыя як цэнтр партызанскага руху на Палессі ў час Вялікай Айчыннай вайны, і тое, што нашчадкі партызан падрыхтуюць добры фальклорны фэст, – сумненняў у мяне не выклікала, але такога, калі шчыра, я не чакаў.

Уражанні ад Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня-2012» – незабыўныя: сотні і нават тысячы маладых прыгожых твараў аматараў фальклору, песні, музыка, беларускія строі, узнёслы настрой – паэзія і жыццё побач. Здаецца – тут уся маладая Беларусь... Тры дні – няспынныя конкурсы калектываў, прыгожых, таленавітых. Прычым гэта ўсё – не «папса», не надакучлівая самадзейнасць, а карэнныя народныя танцы, песні, фрагменты абрадаў з розных рэгіёнаў Беларусі (пра сістэмнасць гэтага ўнікальнага фэсту-праекта этнакультурнага выхавання я выкажуся ніжэй асобна). Агульнае ўражанне ад фэсту ў мяне (чалавека, які мінуў мяжу свайго 80-годдзя і шмат чаго ў жыцці пабачыў) – каласальнае. Калі славяне змогуць адрадзіць уласную традыцыйную духоўнасць – гэта мусяць зрабіць менавіта людзі, прайшоўшыя «Берагіню» і падобныя «варункі» і «гарнілы» загартоўкі душы.

Лічу, што гэты фэст – адзін з найкарысных напрамкаў культурнай дзейнасці беларускай дзяржавы, бездакорна прадуцыруемы на патрыятызм і стабільнасць самастойнай Беларусі, якая вельмі адказна ставіцца да захавання ўласнай вясковай, аграрнай інфраструктуры. Нават некаторыя сур'ёзныя палітыкі суседняй Літувы вымушаны канстатаваць перавагу Беларусі (урада, Прэзідэнта) ў гэтай сферы ў параўнанні з балтыйскімі і славянскімі краінамі-суседзямі. Сёння гэта – аб'ектыўна-гістарычны факт. Безумоўна, «Берагіня» магла з'явіцца толькі на Беларусі. Мае калегі па фестывальным журы – напрыклад, дацэнт Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай акадэміі музыкі (Кансерваторыі) мастацтвазнаўца Ірына Папова, прафесар Ровенскага гуманітарнага ўніверсітэта Мікалай Гадоўскі – гэтую маю думку, неаднаразова выказаную у кулуарах фэсту, падзялялі). Таму мы мусім сваю «Берагіню» абараняць і захоўваць далей, бо інакш – гісторыя нам не даруе.

У гэтам кантэксце вельмі лагічна вызначыць ролю і фальклору наогул, і фестывалю «Берагіня» ў прыватнасці, у культурна-ідэалагічнай падтрымцы аграрнай культуры Беларусі, ахове здаровай духоўнай асновы жыцця моладзі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у рэгіёнах краіны. Пры пісьменнай культурнай палітыцы фальклорны рух (які ва ўмовах «Берагіні» інтэграваны ў шматступенную фестывальна-праектную дзейнасць) наогул здольны спрыяць далейшай стабілізацыі і развіццю вясковай, аграрнай сферы Беларусі. А, як вядома, духоўная народная культура – стрыжань духоўнай культуры нацыянальнай. Адсюль – прамы выхад: *ад аховы народных традыцый – да культурнай бяспекі краіны ўвогуле.* Таму спробы нівеліраваць статус «Берагіні» ў 2014 годзе з рэспубліканскага да рэгіянальнага, замест таго, каб працаваць над яе пераходам у статус дзяржаўнай праграмы (аб чым ёсць, дарэчы, рашэнне Калегіі Міністэрства культуры 2012 года, якое не выканана), – нонсэнс. Мне сорамна казаць пра гэта, але – трэба.

Так, фестываль «Берагіня» сёння – **адзіны ў краіне** сістэмны адладжаны этнакультурна-выхаваўчы праект нацыянальнага маштабу, які мае 15-гадовы паспяховы досвед. Кожныя два гады лепшыя дзіцячыя і юнацкія фальклорныя калектывы розных раёнаў краіны, якія працуюць з мясцовай этнаграфічнай спадчынай (як працаваць – прапісана навукоўцамі ў палажэнні пра фэстываль, і прапісана добра), сустракаюцца на абласных адборачных турах. Тут кожная вобласць адбірае лепшы гурт для заключнага фэсту ў Акцябрскім. Ну, а суперкампетэнтнае журы (навуковыя эксперты-фалькларысты з сталічных УВА культуры і мастацтваў і НАН Беларусі) на фінальных імпрэзах – заўсёды разгледзіць і адданасць мясцовым караням, і мастацкі талент, і камандны дух самабытных фальклорных гуртоў. Як я ўжо казаў, найболей здзіўляў мяне, сівога прафесара, менавіта пяшчотны ўзрост аматараў фальклору на сцэне «Берагіні»: бо гэта – **нашыя дзеці, нашая будучыня** !!! І колькі б чыноўнікі Міністэрства культуры не размаўлялі пра эканомію грошаў і часовыя праблемы галіны культуры – гэта несур'ёзна. Хто ж эканоміць на сваіх дзецях? Хіба што - вар'яты. І замест таго, каб блакаваннем падобных фестываляў правакаваць з'яўленне асацыяльных паводзін у падлеткавым асяродку (што мы сёлета назіраем у выбухах наркаманіі ў рэгіёнах), ці не лепей заняць як мага больш дзяцей і моладзі пераймannем фальклору ва ўсіх яго праявах, як гэта робіць «Берагіня» апошнія 15 год? І гэтым, дарэчы, фэст не першы год выратоўвае нашу моладзь ад шкодных спакус XXI стагоддзя, выхоўвае маладое пакаленне беларусаў у рэчышчы патрыятызму і этнаэкалогіі.

Таму – лічу, што тыя сродкі, якія пойдуць на правядзенне фестывалю ў гэтым годзе, акупяцца «з запасам». А той духоўна-патрыятычны ўздым, які кожны раз выклікае гэты фестываль, тая радасць, задавальненне, гонар за сваю краіну – наогул не маюць кошту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ